***Бічун Вераніка Мечыславаўна,***

***студэнтка юрыдычнага факультэта БДУ***

# АСАБЛІВАСЦІ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА ПРАВА Ў СТАТУЦЕ 1566 ГОДА

Развіццё канстытуцыйнага права Беларусі ў XVI ст. праходзіла пад уздзеяннем унутраных і знешніх сацыяльна-эканамічных і палітычных працэсаў. Звычаёвае права, якое існавала ў старажытнасці на асобных землях Беларусі, было пазбаўлена адзінства, мела асаблівасці ў рэгуляванні праваадносін. Паступова, на працягу XIV-XVI стст., паралельна с працэсам кансалідацыі асобных земляў-княстваў у складзе Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ), праходзіў працэс уніфікацыі права з актыўнай распрацоўкай новых прававых нормаў, якія адпавядалі больш складаным умовам сацыяльна-эканамічнага развіцця дзяржавы. У гэты перыяд зараджаюцца асновы беларускага канстытуцыяналізму.

Канешне, найбольшае значэнне ў развіцці канстытуцыйнага права адыгралі Статуты 1529, 1566, 1588 гг. Статут 1529 года ўнёс шмат новага ў развіццё сусветнай прававой думкі. Але рэфармацыйны рух у дзяржаве, новыя сацыяльна-эканамічныя з’явы, у тым ліку актыўнае развіццё гарадоў і актывізацыя таварна-грашовых адносін, запатрабавалі ўдасканалення права і ўнясення зменаў у заканадаўства. Узнікае ініцыятыва “папраўы” першага Статута. У сувязі з гэтым ствараецца статутовая камісія і ўжо з 1551 г. праект новага закона сістэматычна абмяркоўваецца на соймах дзяржавы (што само па сабе сведчыла аб новым узроўні развіцця дзяржавы і права). Праект Статута распрацоўваўся доўга. У 1561 г. быў пададзены на сойм ужо добра распрацаваны праект закону, аднак зноў пачаліся дэбаты. Потым меркавалася прыняць яго ў 1564 годзе, аднак ён быў уведзены ў дзеянне толькі з 1 сакавіка 1566 года [1, с. 56].

У Статут былі ўключаны тры прывілеі: Віленскі 1563 г., Бельскі 1564 г., Віленскі 1566 г. У структурных адносінах, нягледзячы на пэўныя змены, ён прытрымліваўся папярэдняга Статута, аднак налічваў ужо 14 раздзелаў і 367 артыкулаў. Ён ўтрымліваў нормы ўсіх галін тагачаснага права: канстытуцыйнага, грамадзянскага (у тым ліку абавязальніцкага, закладовага, зямельнага, апякунскага, спадчыннага), шлюбна-сямейнага, адміністрацыйнага, крымінальнага, судова-працэсуальнага і інш. Ён замацоўваў і паўтараў на больш высокім юрыдычным узроўні палажэнні аб адзінстве права на ўсёй тэрыторыі дзяржавы і для ўсіх падданых (хоць па феадальнаму праву яно не магло быць і не было роўным для ўсіх катэгорый насельніцтва), дзяржаўным суверэнітэце, прыярытэце пісанага права, абмежаванні ўлады вялікага князя і г.д. [3, с. 157].

Канстытуцыйнаму праву, як і ў папярэднім Статуце 1529 г., былі прысвечаны першыя тры раздзелы новага звода законаў дзяржавы, хаця канстытуцыйныя нормы ўтрымліваліся і ў іншых раздзелах. Ад імя вялікага князя Статут 1566 года забараняў карыстанне звычаёвым правам і патрабаваў з гэтага часу кіравацца толькі статутавымі нормамі. Ён не толькі больш дакладна і поўна рэгламентаваў дзейнасць такіх вышэйшых органаў дзяржавы, як вялікі князь і рада, але і замацаваў заканадаўчую функцыю сойма. Закон гаварыў аб складзе і кампетэнцыі сойма, аб парадку абрання павятовых дэпутатаў на сойм, аб дзейнасці павятовых соймікаў – органаў шляхецкай дэмакратыі. Улада князя абмяжоўвалася не толькі радай, але і соймам, без згоды якога ён не меў права ўводзіць новыя падаткі, прымаць новыя законы, пачынаць вайну (арт. 2, Р. II).

У Статуце гаварылася аб воінскім абавязку з пералічэннем кола асобаў, якія пры дасягненні паўналецця (з 18 гадоў) паводле пастановы сойма павінны былі несці воінскую службу (арт1, Р. II), а таксама абавязак усіх падданых дзяржавы без пастановы сойма, а ў адпаведнасці з

вялікакняскім лістом ехаць на вайну ў выпадку раптоўнага нападу непрыяцеля (арт. 2, Р. ІІ), прычым вялікі князь абавязваўся нікога не вызваляць (вусным распараджэннем ці спецыяльным лістом) ад воінскай службы (арт.3, Р. ІІ).

Закон абавязваў вялікага князя, усіх князёў, паноў радных, феадалаў, службоўцаў, шляхту, мяшчанаў і “всих людей посполитых… заховати при свободах и вольностях” (р.3, арт.2). Упершыню ў статутовым заканадаўстве шляхце дазвалялася свабодна перамяшчацца па тэрыторыі дзяржавы (як па сушы, так і па вадзе) з мэтай продажу ўласнага (не купленага) збожжа, прычым шляхта вызвалялася ад мытнага і маставога збору [2].

У нормах Статута яскрава праявілася тэндэнцыя аддзялення судовай улады ад выканаўчай, аб чым упершыню было заяўлена на Бельскім сойме прывілеем 1564 года. Рэгламентавалася дзейнасць новых – падкаморскіх і земскіх судоў. Менавіта апошнія з іх упершыню аб'яўляліся выбарнымі, аддзеленымі ад адміністрацыі. Суддзі, да якіх прад'яўляўся шэраг патрабаванняў, выбіраліся на пасады пажыццёва, што сведчыць аб зараджэнні новых, больш прагрэсіўных праваадносін у дзяржаве (арт.1, Р. IV). Шляхта на павятовых сойміках выбірала са свайго асяроддзя суддзямі самых годных і паважаных асобаў (закон рэгламентаваў цэлы комплекс патрабаванняў да кандыдатаў на судовыя пасады). Земскі суд збіраўся на судовыя сесіі (“рокі земскія”) у вызначаныя законам тэрміны тры разы ў год. Ён разглядаў у асноўным грамадзянскія і крымінальныя справы шляхты. Да яго кампетэнцыі адносіліся таксама і натарыяльныя справы. Акрамя таго, у судовыя кнігі земскага суда запісваліся скаргі на незаконныя дзеянні мясцовых службовых асобаў. Статут вызначаў парадак прыняцця судовай пасады суддзямі земскага суда і прыводзіў тэкст прысягі суддзяў, якую яны прыносілі на першай судовай сесіі пры ўступленні на пасаду. У

ёй гаварылася, што суддзі павінны дзейнічаць толькі ў межах закона, судзіць сумленна і справядліва, не баючыся помсты і пагрозаў, не звяртаючы ўвагі на тытулы, пасады, багацце тых ці іншых асобаў, "посулы і дары" і інш. [5, с. 29].

Артыкул 8 раздзела IV забараняў выбіраць суддзямі ў земскія суды прадстаўнікоў духавенства і службовых асобаў мясцовай адміністрацыі. Закон вельмі клапаціўся аб ахове судовай улады і прама патрабаваў паважаць яе. Усялякімі сродкамі стрымліваўся намер замаху на судовую ўладу. Напрыклад, забаранялася ўзброеным асобам (за выключэннем халоднай зброі, якую меў кожны шляхціц) уваходзіць у судовую залу (арт.38, Р. IV). Аб абароне судовай улады, ахове суддзяў сведчаць шматлікія артыкулы 39-43 раздзела IV. Узнікненне і дзейнасць земскіх судоў сведчыла аб новым этапе ў развіцці судовага ладу і судаводства, аб паступальным развіцці феадальнага грамадства.

Статут 1566 года замацоўваў права абароны правоў чалавека ў судовым парадку з дапамогай адваката, прычым удакладнялася, што кожная асоба можа патрабаваць ад суда прызначыць адваката, а бедным людзям, сіротам і ўдовам адвакаты павінны прызначацца бясплатна (арт.33, Р. IV). Вынікам судовай рэформы, якая праходзіла на працягу другой паловы XVI ст., з'явілася ўзнікненне больш дасканалай судовай сістэмы, з'яўленне новых прафесій (суддзі, адваката і інш.), новых прагрэсіўных прынцыпаў судовага ладу і судаводства. Аб гэтым жа сведчыць і стварэнне спецыяльных падкаморскіх судоў для разгляду зямельных спрэчак, што стала вельмі патрэбным у сувязі з атрыманнем шляхтай права на свабоднае распараджэнне зямлёй [4, с. 137].

У адрозненне ад папярэдняга Статута, які дазваляў шляхце распараджацца толькі 1/3 часткай нерухомай маёмасці, Статут 1566 г. у арт.33 раздзела III упершыню запісаў права поўнага распараджэння нерухомасцю.

Менавіта гэтым артыкулам быў акрэслены пераход ад феадальнага права ўласнасці да буржуазнага. Аб зараджэнні буржуазных праваадносінаў сведчыць і артыкул 1 раздзелу VII , які рэгламентаваў працэдуру і ўдакладняў парадак свабоднага распараджэння нерухомасцю.

У аналагічным накірунку развіваліся і спадчынныя праваадносіны, у якія былі ўнесены значныя змены. Толькі парадку наследавання маёмасці і афармленню завяшчальных запісаў (тэстаментаў) быў прысвечаны цэлы новы раздзел закона. Статут нават утрымліваў узоры некаторых юрыдычных дакументаў – завяшчальнага запісу, дагавораў мены, дарэння і інш. Закон клапаціўся аб ахове правоў жанчын і аб іх матэрыяльным забеспячэнні. Напрыклад, гаварылася, што перш чым аддаць дачку замуж, бацька павінен быў патрабаваць ад зяця аформіць спецыяльным лістом на карысць сваёй дачкі пэўную частку нерухомай маёмасці (т. зв. вена, якое, як правіла, афармлялася на 1/3 частку маёмасці). Гэта маёмасць заставалася жанчыне і ў выпадку смерці мужа (арт. 1, Р. V). Гаварылася таксама аб разводах, якія здзяйсняліся духоўным судом, аднак матэрыяльныя наступствы іх уваходзілі ў кампетэнцыю свецкіх судоў і залежылі не толькі ад віны жонкі, але і ад віны мужа (арт.18, Р. V).

Статут паклаў пачатак рэалізацыі пастулата аб роўным пакаранні за забойства чалавека. Ён спрабаваў замацаваць прынцып прэзумпцыі невінаватасці, увёў аднолькавы ўзрост крымінальнай адказнасці асобы з 14 гадоў (арт.8, Р. XIV).

Шэраг артыкулаў дванаццатага раздзела сведчыць аб імкненні заканадаўцы забяспечыць права чалавека на асабістую свабоду, прычым гэта тычылася як людзей "ніжэйшага стану", так і "простага стану". Напрыклад, ні за якае злачынства нельга было аддаваць у вечную няволю свабоднага чалавека (арт. 7), нават пісьмовае афармленне вольнага

чалавека ў няволю ў галодны год лічылася несапраўдным (арт. 11) і інш. [2].

Адзначым, што Статут 1566 г. працягваў дзейнічаць пад назвай “Валынскі Статут” на далучаных да Польшчы ў 1569 г. Валынскім, Кіеўскім, Брацлаўскім ваяводствах (за выключэннем некаторых артыкулаў) і пасля ўвядзення ў дзеянне новага звода законаў дзяржавы – Статута 1588 г.

Такім чынам, Статут 1566 г. замацаваў шмат новых і прагрэсіўных палажэнняў, хаця, перш за ўсё, клапаціўся аб прывілеях шляхты і фактычна афармляў галоўную ролю буйных феадалаў у дзяржаве. Менавіта ў гэтым і праявілася супярэчлівасць Статута: з аднаго боку ён абвяшчаў самыя прагрэсіўныя ідэі і прынцыпы, звяртаючыся да ўсяго насельніцтва і ўдакладняючы: “як да багатых, так і да бедных”, “як да людзей вышэйшага стану, так і да людзей ніжэйшага стану”, а з другога боку, – перш за ўсё, абараняў інтарэсы феадалаў. Будучы законам феадальнай дзяржавы, Статут увабраў у сябе ўсе характэрныя рысы і супярэчнасці тагачасных грамадскіх адносін. Аднак яго палажэнні адначасова адлюстроўвалі і паступальную тэндэнцыю ў развіцці грамадства.

Статут 1566 г. замацоўваў і паўтараў на больш высокім юрыдычным узроўні палажэнні аб адзінстве права на ўсей тэрыторыі дзяржавы і для ўсіх падданых, дзяржаўным суверэнітэце, прыярытэце пісанага права, абмежаванні ўлады вялікага князя і г. д. Улада князя абмяжоўвалася не толькі радай, але і соймам, без згоды якога ён не меў права пачынаць вайну, уводзіць новыя падаткі, прымаць новыя законы (р. 2, арт. 2). Упершыню ў статутовых нормах праяўляецца тэндэнцыя аддзялення судовай улады ад выканаўчай. Як і папярэднія законы, Статут 1566 г. перш за ўсе

клапаціўся аб шляхце, заканадаўча замацоўваў галоўную ролю буйных феадалаў у дзяржаве і іх прывілеі.

## ЛІТАРАТУРА

1. Гудавичюс, Э. История Литвы с древнейших времен до 1569 года [Текст]. Т. 1 / Э. Гудавичюс ; Фонд им. И. Д. Сытина : Baltrus. – Москва, 2005. – 430 с. – 5000 экз. – ISBN 5-94953-029-2.

2. Доўнар, Т. І. Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года [Тэкст] / Т. І. Доўнар, У. М. Сатолін, Я. А. Юхо. – Мінск: Тэсэй, 2003. – 352 с. – 1000 экз. – ISBN 985-463-080-3.

3. Доўнар, Т. І. Характэрныя рысы і асаблівасці прававога развіцця Беларусі на важнейшых гістарычных этапах [Тэкст] / Т. І. Доўнар // Веснік БДУ. Серыя 3. – 2009. – № 1. – С. 112–122.

4. Ключевский, В. О. Русская история. Полный курс лекций [Текст] : в 3 книгах. Кн. 2. / В. О. Ключевский. – Москва: Мысль, 1995. – 572 с. – 75000 экз. – ISBN 5-244-00730-0.

5. Лазутка, С. А. I Литовский статут – феодальный кодекс Великого княжества Литовского [Текст] / С. А. Лазутка ; М-во выс. и средн. спец. образования Литов. ССР, Вильнюс. гос. ун-т им. В. Капсукаса, кафедра истории ЛитССР. – Вильнюс, 1973. – 213 с. – 200 экз. – ISBN 50 к.